МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# КАМІТЭТ ПА АХОВЕ ГІСТОРЫКА- КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

# АХОЎНАЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА № 4664

АД 18. 07. 1999 г.

ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ
*Месца згубы ахвяр палітычных рэпрэсій "КУРАПАТЫ"*

УЛАСНІК
*Мінская лесапаркавая гаспадарка.*
*Мінск, вул. Адаеўскага, 58.*

МЕСЦАЗНАХОДЖАННЕ
*Савецкі раён г. Мінска*

У адпаведнасці з артыкулам 84 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" ***Мінская лесапаркавая гаспадарка*** у асобе дырэктара *Казака Нікалая Васільевіча* заяўляе, што
яго кіраўніцтву, адказным і выканаўчым гаспадарчым службам вядома, што названы археалагічны аб'ект з'яўляецца нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю і што ўсякія дзеянні ў дачыненні да яго павінны праводзіцца без парушэння патрабаванняў Закона Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны".

Кіраўніцтву таксама вядома, што ўсякія работы, якія могуць прывесці да зменаў каштоўнасці, павінны праводзіцца толькі па ўзгадненню з паўнамоцнымі прадстаўнікамі Камітэта па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь.

Кіраўніцтву вядомы абавязак дапускаць да правядзення даследчых работ на каштоўнасці спецыялістаў, якія маюць на гэта адпаведны дазвол *(адкрыты ліст)*, выдадзенны Інстытутам гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі і зарэгістраваны ў Камітэце па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

Уласник абавязуецца ўтрымліваць гисторыка-культурную каштоцнасць у добрым стане, прымаць ўсе магчымыя меры па захаванню яго каштоўных вартасцей; паведамляць у Камітэт па ахове гісторыка-культурнай спадчыны аб пагрозах існаванню і захаванню каштоўнасці, усіх выпадках прычынення ёй шкоды не пазней аднаго тыдня з моманту выяўлення шкоды, або ўзнікнення магчымага прычынення шкоды.

*( кіраўнік прадпрыемства)* — *( подпіс)*

*( Ахоўнае абавязацельства складзена ў 3-х экземплярах)*

ДП Мінская лесапаркавая гаспадарка

Рэспубліка Беларусь
213 37 90

Факс (017)